ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# Гомельскі універсітэт

№ 18 (919) | Аўторак, 10 СНЕЖНЯ 1996 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная

## НА САВЕЦЕ УНІВЕРСІТЭТА

У апошні чацвер лістапада адбылося чарговае ў гэтым навучальным годзе пасяджэнне Савета універсітэта. Першым на парадку дня стаяла пытанне аб рабоце дэканата і кафедр факультэта фізічнай культуры па ўдасканальванню спартыўнага майстэрства студэнтаў. З дакладам выступіў намеснік дэкана названага факультэта М.А.Кульбакоў.

Справаздачу аб рабоце аспірантуры зрабіў прарэктар па навуковай рабоце прафесар А.М.Сердзюкоў. Па яго ж інфармацыях Савет дазволіў найбольш вопытным кандыдатам навук кіраваць аспірантамі, зацвердзіў тэму доктарскай дысертацыі дэкану фізічнага факультэта дацэнту І.В.Семчанку, падтрымаў кандыдатаў на выбранне ў Акадэмію навук Рэспублікі Беларусь: акадэмікам -- дырэктара Інстытута гісторыі АН Беларусі М.П.Касцюка, членамі-карэспандэнтамі -- міністра адукацыі і навукі В.І. Стражава, рэктара Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы пры Белдзяржуніверсітэце В.А. Гайсёнка, дэкана матэматычнага факультэта БДУ М.І.Юрчука.

Адказны сакратар прыёмнай камісіі універсітэта С.Ф.Каморнікаў азнаёміў членаў Савета з праектам правіл прыёму ў ГДУ на наступны навучальны год.

Савет зацвердзіў палажэнне аб культурным цэнтры універсітэта, аб якім далажыў А.В.Лысянкоў.

На конкурснай аснове на вакантныя пасады абраны загадчыкамі кафедр: эканомікі і кіравання вытворчасцю дацэнт Т.В.Карпей, геаэкалогіі -- кандыдат геолага-мінералагічных навук А.М.Гумен, геаграфіі -- кандыдат геаграфічных навук І.І.Богдэль. Старшымі выкладчыкамі абраны У.А.Галавач і В.А.Харытошкін па кафедры фізічнага выхавання.

На Савеце былі разгледжаны таксама некаторыя іншыя пытанні універсітэцкага жыцця.





## НАВУЧАННЮ СТУДЭНТАЎ -- ТРЫВАЛУЮ АСНОВУ

Стала добрай традыцыяй праводзіць на кафедры батанікі і фізіялогіі раслін семінары па батанічных, лесаводчых і экалагічных праблемах рэгіёна з запрашэннем спецыялістаў вядучых устаноў. Іх ініцыятарам з'яўляецца загадчык кафедры доктар біялагічных навук, прафесар Валянцін Васільевіч Валетаў.

Нядаўна пад яго старшынствам прайшоў чарговы семінар, у якім прынялі ўдзел студэнты, аспіранты і выкладчыкі біялагічнага факультэта. Перад імі выступілі намеснік галоўнага дзяржаўнага санітарнага ўрача Гомельскай вобласці Мікалай Рыгоравіч Скаромны, які зрабіў грунтоўны даклад на тэму: "Медыка-біялагічныя праблемы Гомельскага рэгіёна", і кіраўнік лабараторыі па абслугоўванню народнай гаспадаркі Гомельскага гідраметэацэнтра Уладзімір Іванавіч Козінаў з паведамленнем "Маніторынг і ахова навакольнага асяроддзя". Інфармацыя была выслухана з вялікай ўвагай. Выступаючым было зададзена шмат пытанняў, на якія яны далі вычарпальныя адказы.

Карысць такіх семінараў відавочная, асабліва для студэнтаў, якія з першых рук атрымалі інфармацыю аб стане навакольнага асяроддзя, яго рэсурсах і здароўі насельніцтва ў нашым рэгіёне. Атрыманую інфармацыю студэнты могуць выкарыстаць пры выкананні курсавых і дыпломных праектаў. Акрамя таго, дасягнута дамоўленасць, што нашы студэнты могуць праходзіць вытворчую практыку на базе ўстаноў, прадстаўнікі якіх прынялі ўдзел у семінары. Гэта дае магчымасць асвойваць новыя методыкі пры выкананні лабараторных аналізаў глебы, вады, паветра, дазваляе павысіць узровень падрыхтоўкі спецыялістаў-біёлагаў.

Семінар у чарговы раз паказаў, што кафедра імкнецца выконваць рэкамендацыі рэктарата універсітэта па пашырэнні творчых кантактаў, тэхнічным аснашчэнні творчага працэсу, а таксама даводзіць да студэнтаў інфармацыю аб тых практычных праграмах, якія вырашаюцца ў рэгіёне.

**С.АЛЕШКА,**
**дэкан біялагічнага факультэта, дацэнт.**
**На здымку: выступае М.Р.Скаромны.**
**Фота У.ЧЫСЦІКА.**

### З УЗНАГАРОДАЙ!

***За шматгадовую плённую навуковую і вучэбную работу па падрыхтоўцы маладых спецыялістаў, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці дацэнт кафедры агульнай фізікі СТРЫЖНЁЎ Уладзімір Сямёнавіч узнагароджаны Ганаровай граматай універсітэта.***

## ПЕРШАЯ АБАРОНА Ў ФІЛОЛАГАЎ

Гэты лістападаўскі дзень стане адметнай вяхой у гісторыі не толькі філалагічнага факультэта, але і ўсяго нашага універсітэта. Адбылося першае пасяджэнне спецыялізаванага Савета па абароне кандыдацкіх дысертацый па беларускай мове. І ў пэўным сэнсе слова яго можна назваць сімвалічным. Пасяджэнне праходзіла ў пакоі музея Ф.Скарыны.

Слова даецца першаму прарэктару універсітэта М.В.Селькіну. Ён гаворыць аб тым, што стварэнне пры ГДУ чатырох спецыялізаваных Саветаў па абароне доктарскіх і кандыдацкіх дысертацый, у тым ліку і кандыдацкіх дысертацый па беларускай мове, з'яўляецца пацвярджэннем высокага навуковага патэнцыялу вядучай вышэйшай навучальнай установы Беларускага Палесся. Гэта дазволіць яшчэ больш актывізаваць навуковыя даследаванні па важных напрамках, рыхтаваць дастойную змену старэйшаму пакаленню вучоных.

Усхваляваным было выступленне старшыні спецыялізаванага Савета па абароне кандыдацкіх дысертацый па беларускай мове доктара філалагічных навук, заслужанага дзеяча навукі Рэспублікі Беларусь, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Беларусі, прафесара кафедры беларускай мовы У.В.Анічэнкі. Ён расказаў пра той плённы шлях, які прывёў да стварэння ў ГДУ спецыялізаванага Савета па філалагічнай дысцыпліне.



Пачынальніцай абароны кандыдацкай дысертацыі па беларускай мове стала малодшы навуковы супрацоўнік лінгвістычнай лабараторыі ГДУ Святлана Міхайлаўна Струкава. У свой час яна паспяхова закончыла беларускае аддзяленне філалагічнага факультэта нашага універсітэта, на працягу некалькіх гадоў, пачынаючы са студэнцтва, адначасова з асноўнай працай, мэтанакіравана займалася навуковымі даследаваннямі. На яе рахунку ўжо 12 публікацый. Усе яны датычацца пераемнасці і эвалюцыі лексічных традыцый у беларускай мове. Гэта і стала тэмай дысертацыйнага даследавання аспіранткі-завочніцы, навуковым кіраўніком якой быў прафесар У.В.Анічэнка.

На сваю дысертацыю С.М.Струкава атрымала добры водзыў кафедры беларускай мовы Белдзяржуніверсітэта і афіцыйных апанентаў: доктара філалагічных навук, прафесара, члена-карэспандэнта АН Беларусі А.М.Булыкі і кандыдата філалагічных навук, дацэнта Мазырскага дзяржпедінстытута У.К.Піскуна.

Абарона дысертацыі С.М.Струкавай прайшла паспяхова. Аб гэтым сведчыць і канчатковы вынік: усе 9 членаў спецыялізаванага Савета прагаласавалі за прысуджэнне Святлане Міхайлаўне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук.

**Б.ВАЛОДЗІН.**

**На здымку: кандыдацкую дысертацыю абараняе С.М.Струкава.**

**Фота У.ЧЫСЦІКА.**

*Міжнародная канферэнцыя*

## ПА ПРАБЛЕМАХ БЕЛАРУСКАГА ПАЛЕССЯ

Міністэрства адукацыі і навукі Рэспублікі Беларусь, Беларускі інстытут інфармацыі і прагнозу пры Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Мазырскі дзяржаўны педагагічны інстытут і Брэсцкі дзяржаўны універсітэт правялі ў горадзе над Прыпяццю -- Мазыры прадстаўнічую Міжнародную канферэнцыю "Праблемы адукацыі, навукі і культуры Беларускага Палесся". У яе ўключана 210 навуковых дакладаў і паведамленняў вучоных з Гомеля, Мазыра, Брэста, Мінска, Віцебска, Жытоміра, Курска, Тулы, Быдгашча (Польшча).

У навуковых дакладах і паведамленнях асветлены праблемы беларускай і рускай моў і методыкі іх выкладання, беларускай і рускай літаратур, этнаграфіі, фальклору, мастацтва і культуры; выхавання і адукацыі; метадычнай падрыхтоўкі ў школе, ПТВ, ВНУ; працоўнага навучання і прафесійнай падрыхтоўкі; грамадскіх навук; экалогіі і біёлага-прыродазнаўчых дысцыплін.

Гомель на канферэнцыі быў прадстаўлены вучонымі дзяржаўнага універсітэта імя Ф.Скарыны, абласнога інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў адукацыі.

Да тых праблем, якія абмяркоўваліся і даследаваліся на канферэнцыі, маюць дачыненне ледзь не ўсе кафедры нашага універсітэта. Але даслалі свае навуковыя даклады і паведамленні толькі вучоныя і выкладчыкі кафедр беларускай мовы, беларускай літаратуры, беларускай культуры. Астатнія ўпусцілі такую выдатную магчымасць данесці да міжнароднай навуковай грамадскасці вынікі сваіх даследаванняў.

Па выніках канферэнцыі апублікаваны зборнік навуковых прац у дзвюх частках. Там змешчаны даклады У.В.Анічэнкі, У.А.Бобрыка, Л.П.Кузьміча, Л.М.Мінаковай, А.М.Палуян, Д.Д.Паўлаўца, Р.У.Серыкава, А.А.Станкевіч, В.К.Шынкарэнка. Непасрэдны ўдзел у канферэнцыі прынялі, на жаль, толькі два прадстаўнікі нашага універсітэта -- прафесар кафедры беларускай мовы У.В.Анічэнка і аўтар дадзеных радкоў.

**К.УСОВІЧ, заг. музея-лабараторыі Ф.Скарыны.**



## ПРА ТОЕ, ШТО ХВАЛЮЕ СТУДЭНТАЎ

***Як вядома, у кастрычніку рэктар ГДУ член-карэспандэнт АН Беларусі Л.А.Шамяткоў правёў у актавай зале шэраг сустрэч са студэнтамі ўсіх факультэтаў. На іх адбылася яго шчырая размова з моладдзю па пытаннях сацыяльна-эканамічнага жыцця нашай рэспублікі, па важнейшых праблемах вышэйшай адукацыі і нашага універсітэта ў прыватнасці. У час гэтых сустрэч студэнтамі было зададзена шмат пытанняў. Аднак з-за ліміту часу некаторыя пытанні, што хвалююць сёння студэнтаў, засталіся без адказу. Сёння на іх на старонках нашай газеты адказваюць кіруючыя работнікі ГДУ.***

-- ***У якіх выпадках адбываецца адлічэнне студэнтаў з універсітэта?***

-- На падставе інструкцыі "Аб парадку пераводу, аднаўлення і адлічэння студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў", зацверджанай загадам Міністэрства адукацыі і навукі Рэспублікі Беларусь N192 ад 1 ліпеня 1994 года і ўзгодненай з Дзяржкампрацы РБ, студэнт можа быць адлічаны з ВНУ: па асабістаму жаданню; у сувязі з пераводам у іншую ВНУ; па стану здароўя на падставе заключэння УКК; за акадэмічную непаспяховасць; за сістэматычнае парушэнне вучэбнай (працоўнай) дысцыпліны і правіл унутранага распарадку ВНУ.

-- ***У якіх выпадках экзамен можна здаваць больш двух разоў?***

-- Згодна "Палажэння аб курсавых экзаменах і заліках у вышэйшых навучальных установах", зацверджанага загадам Міністэрства адукацыі і навукі Рэспублікі Беларусь N235-А ад 22.08.94 г.: студэнты дзённай формы навучання дапускаюцца да экзаменацыйнай сесіі пры ўмове здачы ўсіх залікаў, прадугледжаных вучэбным планам, выканання і здачы ўстаноўленых разлікова-графічных і іншых работ па дысцыплінах вучэбнага плана бягучага семестра.

Няяўка на экзамен адзначаецца ў залікова-экзаменацыйнай ведамасці словамі "не з'явіўся". Калі студэнт не з'явіўся на экзамен без ўважлівай прычыны, ставіцца нездавальняючая адзнака дэканам факультэта.

Пераздача экзамена са здавальняючай адзнакай у перыяд экзаменацыйнай сесіі, як правіла, не дапускаецца. У асобных выпадках пры наяўнасці ўважлівых прычын дэкан факультэта можа дазволіць студэнтам пераздачу ў перыяд экзаменацыйнай сесіі аднаго экзамена па дысцыпліне, па якой атрымана нездавальняючая адзнака.

Пераздача экзамена з нездавальняючай адзнакай па адной і той жа дысцыпліне дапускаецца не больш чым 2 разы.

Для ліквідацыі акадэмічнай запазычанасці па выніках зімовай сесіі дэкан факультэта ўстанаўлівае індывідуальныя тэрміны, але не пазней першага месяца семестра, які ідзе за сесіяй.

-- ***За якія парушэнні студэнты могуць панесці спагнанне?***

-- Імі з'яўляюцца: невыкананне вучэбных даручэнняў, прадугледжаных графікам навучальнага працэсу (пропуск, у прыватнасці, вучэбных заняткаў без уважлівых прычын); за 18 гадзін пропускаў без уважлівых прычын студэнт пазбаўляецца стыпендыі; за 48 гадзін пропускаў прагульшчык адлічваецца з ВНУ; парушэнне Правіл унутранага распарадку, зацверджаных Саветам універсітэта па ўзгадненню з прафсаюзным камітэтам 4 студзеня 1990 года (распіццё спіртных напіткаў у вучэбных карпусах, у інтэрнатах і на тэрыторыі універсітэта; курэнне на тэрыторыі універсітэта ва неўстаноўленых месцах; з'яўленне ў вучэбных карпусах, у інтэрнатах і на тэрыторыі універсітэта ў нецвярозым стане; антысанітарны стан жылых памяшканняў у інтэрнатах).

За парушэнне вучэбнай дысцыпліны прымаюцца меры дысцыплінарнага або грамадскага ўздзеяння, а таксама іншыя меры, прадугледжаныя дзеючым заканадаўствам. Дысцыплінарныя спагнанні накладваюцца рэктарам і аб'яўляюцца ў загадзе.

За парушэнне абавязкаў, правіл унутранага распарадку для студэнтаў, аспірантаў, слухачоў падрыхтоўчага аддзялення можа прымяняцца адно з наступных спагнанняў: заўвага; вымова; строгая вымова; высяленне з інтэрната; адлічэнне з універсітэта.

-- ***Куды звярнуцца, калі адбываецца моцны націск на студэнта з боку выкладчыка?***

-- У гэтым выпадку студэнт можа звярнуцца да дэкана факультэта, у прафсаюзны камітэт або да рэктара універсітэта.

-- ***Ці магчыма вырашэнне пытання аб скарачэнні часу заняткаў на другой змене да 18.00?***

-- У сучасных умовах работы універсітэта рашэнне гэтага пытання немагчыма з-за недахопу вучэбных плошчаў і па санітарных нормах.

-- ***Ці магчыма павялічыць вялікі перапынак на першай змене да 30 хвілін?***

-- Гэтае пытанне патрабуе дадатковага вывучэння.

-- ***Калі будзе парадак у занятках фізкультурай у спартыўных залах?***

-- Пры адсутнасці дастатковага фінансавання універсітэт не мае магчымасцей арэндаваць залы для ўказаных заняткаў. Але мы ўвесь час шукаем магчымасці для арэнды фізкультурных залаў і басейнаў за кошт спонсараў, дагавораў аб супрацоўніцтве і г.д.

-- ***Чаму затрымліваюць выплату 50% чарнобыльскай надбаўкі?***

-- Выплата ўказанай надбаўкі робіцца па меры фінансавання універсітэта неабходнымі сродкамі з гарадскога бюджэту.

**(Заканчэнне адказаў на зададзеныя пытанні будзе змешчана ў наступным нумары газеты).**

# І ДА МІНУЛАГА МОЖНА ДАКРАНУЦЦА

Адбылася сустрэча студэнтаў-першакурснікаў філалагічнага факультэта з Мікалаем Фёдаравічам Макарцовым, рэжысёрам-пастаноўшчыкам рэспубліканскай дырэкцыі нацыянальных мастацкіх праграм.

Выпускнік Беларускага універсітэта культуры, Мікалай Фёдаравіч, бадай, адразу знайшоў шлях да сэрцаў гледачоў. У свой час ён стварыў у Гомелі фальклорны тэатр "Жалейка", які панёс сваё прафесійнае мастацтва ў народ. Мікалай Макарцоў ставіў спектаклі, масавыя відовішчы, дзеі якіх праходзілі на адкрытых пляцоўках, у прыродных умовах пры дапамозе шматлікіх выканаўцаў самых розных узростаў. Гэта, па словах самога Мікалая Фёдаравіча, дае магчымасць нават малым дзецям дакрануцца да старажытнасці.

Са сваёй "Жалейкай" гэты таленавіты чалавек пабываў на Палессі, выступаў у Мінску і іншых гарадах Беларусі, гастраляваў на Украіне, у Расіі, Польшчы і нават у Індыі.

Сапраўды кажуць, што таленавіты чалавек таленавіты ва ўсім. Дастаткова было толькі паслухаць Мікалая Фёдаравіча, каб адразу перанесціся да магутных сцен Мірскога замка, убачыць навакольную прыгажосць з вышыні роднага блакіту, апынуцца ў прыгонніцкім тэатры Уршулы Радзівіл. З захапленнем слухалі мы сумную гісторыю аднаго возера, якое кожны год брала сабе жывую ахвяру.

Распавядаючы пра сваю дзейнасць, М.Макарцоў закранаў розныя бакі тэатральнага жыцця. Было ўсё: цяжкасці з фінансаваннем народных святаў і пастановак, радасць за поспехі і перамогі. Асабліва спадабаліся нам займальныя, цікавыя і часам смешныя гісторыі з тэатральнага жыцця.

Спадзяемся, што ў хуткім часе Мікалай Фёдаравіч Макарцоў парадуе жыхароў вялікіх і малых гарадоў Беларусі сваімі новымі непаўторнымі і самабытнымі спектаклямі.

**Галіна МІГАЙ,**
**студэнтка гр.Б-12**
**філалагічнага факультэта.**

ТЭАТР

# НА АРЭНЕ -- "ФРЭДЗІ"

На якія толькі злачынствы не падбівае людзей прага нажывы і славы?!

Слава і ашуканства, грошы і забойства -- усё гэта прысутнічае ў камедыі Рабэра Тама "Фрэдзі", што зараз прапаноўваецца для прагляду ў нашым абласным драматычным тэатры.

Прысутнасць праблем матэрыяльнага характару, праблем выбару, віны і адказнасці рэжысёр Якаў Наталаў і акцёры тэатра вырашаюць даволі ёмка, з гумарам, іроніяй.

Фабула п'есы даволі заблытаная, як у сапраўдным вострасюжэтным дэтэктыве. Цырк "Фрэдзі" на мяжы разарэння. Дырэктар цырка (сам клоун Фрэдзі) усімі праўдамі і няпраўдамі хоча знайсці паратунак сабе і акцёрам цырка. Становішча складанае: крэдыторы патрабуюць выплаты падаткаў. Паліцэйскі інспектар Палю гэтым часам займаецца расследаваннем забойства ліхвяркі, паслугамі якой заўсёды карыстаўся Фрэдзі. Палю ўгаворвае дырэктара ўзяць віну на сябе і гарантуе поўнае апраўданне. Гэтае пагадненне, як лічыць інспектар, выгадна ім абодвум. У выніку Палю стане камісарам, Фрэдзі атрымае рэкламу, а разам з гэтым славу "забойцы-цыркача" і, канешне, грошы. Усё так і атрымалася, але праблем ад гэтага не стала менш.

З аднаго боку, Фрэдзі заслугоўвае нашага спачування, разумення. Ён ўзняўся вышэй дазволенага, узяўшы на сябе віну іншага чалавека. З другога ж боку, ён робіцца "без віны вінаватым" на карысць сабе.

Але менавіта тут і пачынаецца камедыя. З'яўляецца жанчына, якая называе сябе Марго, і прызнаецца Фрэдзі, што гэта яна забіла ліхвярку і патрабуе грошы. Нікаля раіць бацьку атруціць яе. Толькі ў самы апошні момант выяўляецца, што сапраўдным забойцам была пляменніца ліхвяркі, на першы погляд, бяскрыўдная Ева.

Хачу адзначыць, што акцёрам удалося насыціць п'есу сапраўднай атмасферай чалавечай няўпэўненасці, паказаць сляды праўдзівых і горкіх чалавечых пачуццяў.

У Фрэдзі ёсць сын, які крытыкуе бацьку. Гэта значыць, узнікае яшчэ адна тэма -- бацькоў і дзяцей -- паказ дзейснай моладзі, якая прыходзіць на змену "бульварнаму" пакаленню бацькоў.

У п'есе існуе "любоўны трохкутнік": Лулу -- Нікаля -- Ева. Артысты цудоўна абыгралі гэтую спрадвечную праблему.

Наогул, французскія варыянты дэтэктываў, як правіла, больш бяскрыўдныя і фрывольныя, чым амерыканскія. Забойства ліхвяркі, якое "штурхаюць", пераносяць і перакідваюць то на аднаго віноўніка, то на другога, як валейбольны мяч, і паліцэйскае следства -- толькі падстава для камедыйнай ігры на тэму: да чаго даводзіць прага валодаць багаццем, славай.

Дзякуючы выдатным якасцям акцёраў, мы сапраўды атрымалі задавальненне ад пастаноўкі. У героях п'есы гледачы распазналі бліскучых майстроў па вядзенню інтрыгі, а таксама па дынамізму і дасціпнасці дыялогаў.

Я хачу прапанаваць чытачам "Гомельскага універсітэта" наведаць драматычны тэатр і паглядзець п'есу "Фрэдзі". Вы правядзеце незабыўны вечар разам з таленавітымі акцёрамі і пакінеце тэатр вельмі задаволенымі.

**А.ЛЯМЕШКА,**
**студэнтка гр.Б-32**
**філалагічнага факультэта.**

Выставки

# "НЕЖНОСТЬ НА СКВОЗНЯКЕ"

Персональная выставка молодого гомельского художника Евгения Дворочкина — это своеобразный творческий отчет автора за последние четыре года его деятельности.

На ней представлено более ста живописных и графических работ, в которых легко отыскиваются как авторские фантазии и мечтания, так и пережитые, пропущенные через себя проблемы личности и общества.

Некоторый гротеск в работах и необычность их тем могут показаться чем-то излишним, отвлекающим от реальности, хотя на самом деле являются, с одной стороны, субъективным отражением действительности, а с другой -- авторским "лицом" художника, его стилем.

Открытие выставки прошло в необычной форме, в соединении просмотра экспозиции с выступлением народной хоровой капеллы "Дзянніца" под руководством Николая Козлова. Такое соединение искусств, по мнению руководителя капеллы, дает возможность острее почувствовать значимость произведения, глубже окунуться в мир прекрасного.

Многие посетители выставки с благодарностью отзываются о руководстве университета за представленную возможность посещать выставки мастеров искусств прямо в стенах ГГУ. Надеемся, что эта и все последущие экспозиции будут пользоваться популярностью как у сотрудников и студентов университета, так и у гомельчан.

**Сергей КОВАЛЬ,**
**работник культурного центра ГГУ.**



Возвращаясь к напечатанному

# НИЧТО НЕ ПРОХОДИТ БЕССЛЕДНО

Письмо студентки группы Б-41 Н.Проводниковой, опубликованное в №16 "Гомельскага універсітэта", вызвало у меня чувство удовлетворения и удивления одновременно. Хорошо, что есть реакция на проблему бездомных животных и желание объединиться для ее решения. Но ожидать ощутимых результатов за один год существования общества защиты животных?..

Действительно, бездомных животных не становится меньше, напротив, их число катастрофически увеличивается. "А чаму б не арганізаваць спецыяльныя вальеры для бяздомных жывёл? -- спрашивает Н.Проводникова. Да, это идеальный вариант! Но пробовала ли она просить у нашего горисполкома хотя бы дырочку от бублика? Нет? Мы уже год пытаемся убедить городских чиновников от власти в необходимости предоставить обществу защиты животных помещение, в котором мы могли бы осуществлять зоозащитную программу: собирать, лечить, стерилизовать бездомных животных, подыскивать им новых хозяев, а в случае необходимости применять эвтаназию цивилизованным методом. Создание приюта, безусловно, решило бы проблему неконтролируемого размножения животных и роста кожных заболеваний. Но в ноябре горисполком вновь обманул ожидания ОЗЖ и выделил обещанный нам участок Гомельской спецавтобазе по саночистке города. Не спешите радоваться, а вдумайтесь, какие задачи будут решаться в здании, ранее принадлежавшем бывшему клубу собаководства по ул.Украинской, 19: отлов собак, их сортировка и продажа (?!). Что означает слово "продажа" в данном контексте? Возможно, отловленных собак будут сортировать по упитанности -- на мясо для других собак, имеющих "крутых" хозяев?

Возможно, продажа собак будет осуществляться с некой другой коммерческой целью. Но какова бы ни была эта цель, она носит антигуманный характер. Я прошу обратить внимание на сам факт и подумать: может ли такой метод снизить количество бездомных животных и вероятность кожных заболеваний? Учтите, речь идет только о собаках, но ведь именно кошки чаще всего являются разносчиками микроспории! Однако горисполком это не беспокоит. Всюду я слышу: "Мы не разбираемся в тонкостях вашей работы; какая нам разница -- отстреливать или кастрировать, лишь бы их не было". Так что же, устроим в нашем городе собаче-кошачий "Бабий Яр"? Но потом не жалуйтесь, когда закаленные в "боях" с беззащитными животными, современные "шариковы", опьяненные запахом крови, безнаказанностью и вседозволенностью, станут самоутверждаться, убивая двуногих...

Для тех, кто не понимает, какую важную роль играют общества защиты животных, даю справку. Зоозащитой в мире занимается очень много организаций, которые играют значительную роль в Европарламенте. Для любой страны, претендующей на звание цивилизованного общества, защита животных и предотвращение жестокого обращения с ними -- это повышение ее международного реноме.

Что значит защищать животных? Это не только собирать их в приюты, не только передавать в хорошие руки, новым хозяевам. Это, в первую очередь, осознание того, что животное не игрушка, и его нельзя брать только для забавы, а потом, встретив какие-либо трудности в воспитании щенка или котенка, выбросить на улицу. В чем (или в ком?) причина роста численности четвероногих бродяг? Кто виноват в этой проблеме -- животные или человек? Есть редкие, правда, случаи, когда животное, протестуя против жестоких и несправедливых побоев, убегает от своего хозяина. На такие и на любые другие факты жестокого обращения с животными мы как зоозащитники должны реагировать. Жалко, что наказанием для садистов является только штраф. Но если бы хоть эта статья законодательства всегда безотказно выполнялась, было бы уже неплохо: многие бы задумались, прежде чем поднять руку на беззащитное, слабое живое существо. Жалеть нужно не Авсеенко Виталия, студента гр. Ф-22, а тех детей, которых он через три года будет обучать физике в СШ №7.

Относительно того, что можно было бы "арганізаваць нейкую суполку, якая б перадавала здаровых жывёл жыхарам, якія хочуць мець хатніх жывёл". За минувший год наше ОЗЖ передало новым хозяевам 431 животное. Это внушительная цифра. Но мы не знаем, сколько особей из этого числа опять оказалось на улице.

Еще один важный момент. Н.Проводниковой, прежде чем писать что-либо на тему животных и штрафов, необходимо было бы встретиться со мной (найти ведь не трудно) и поинтересоваться состоянием дел в ОЗЖ "Доброта". Тогда она не терялась бы в догадках: "колькі разоў на тыдні" нам звонят; что мы делаем в остальное время: "цярпліва сядзім і чакаем наступнага тэлефанавання ці займаемся папяровай валакітай". Она бы ясно представляла себе структуру, цели и задачи ОЗЖ. И ее, вероятно, удивил бы тот факт, что 46 членов нашего общества содержат мини-приюты у себя дома: это от 6 до 19 животных (кошек и собак вместе) в одной квартире плюс более 50 точек в городе, куда в установленное время на благотворительные обеды и ужины собираются бездомные бедолаги. А кормят их наши активисты за свои зарплаты и пенсии.

И правда, где "наша гуманнасць, практычнасць, разумнасць, позірк у будучыню"? До тех пор, пока мы будем защищать садистов, мучителей беззащитных кошек, собак, птиц и других зверей, нас нельзя будет считать Людьми, ибо "праведный печется и о жизни скота своего, сердце же нечестивых жестоко". Взгляд, устремленный в будущее, -- это не только законодательная ответственность, это и доброта, проникающая в глубины подсознания человека. А душа человека, заявляющего о нравственности, гуманности, должна быть чиста настолько, чтобы не стыдно было подписываться под своей статьей собственным именем, а не псевдонимом, как это сделала госпожа Н.Проводникова, т.к. студентки под такой фамилией нет ни среди филологов, ни среди биологов нашего университета.

И еще. Стоит ли валить в одну кучу разные по значению и способу реализации проблемы? В статье, написанной вроде бы по следам выступления председателя ОЗЖ "Доброта", в едином конгломерате наряду с проблемами животных, затронуты проблемы загрязнения окружающей среды, поведения в общественном транспорте, пьянства подростков и проч. Какое касательство они имеют к взиманию штрафов за жестокое обращение с животными в частности или к ОЗЖ "Доброта" вообще? Для этого существуют иные формы ответственности. Однако аноним, скрывающийся под псевдонимом "Н.Проводникова", прав в одном: "...давайце ж разам паспрабуем што-небудзь змяніць у гэтым жыцці. Нам жа ісці ў будучыню, нам вучыць нашых дзяцей".

Гомельскому обществу защиты животных "Доброта" необходимы добровольцы, способные принять участие в деле защиты животных -- давайте объединяться! Нам нужны люди, которые будут в процессе общения с представителями общественности, государственных структур и отдельными влиятельными лицами проводить политику мирового сообщества зоозащитников в плане гуманного отношения ко всем живым формам на Земле.

Закончить свою статью хочу призывом ко всем, кому дорого будущее без насилия, жестокости, хамства: вступайте в ряды зоозащитников, помогите себе и своим будущим детям не только выжить в эти мрачные времена процветания жестокости, не только сохранить свое человеческое лицо и достоинство, но и сохранить экологический баланс в природе -- ничто не проходит бесследно!

**Т.АВДОНИНА,**
**ст. преподаватель кафедры психологии и довузовской подготовки, член научно-методического совета Белорусской республиканской ассоциации "Зеленый класс", председатель ОЗЖ "Доброта".**

Рэцэнзіі

## СЛОВА БЕЛАРУСКАЕ

***Нядаўна ўбачыла свет яшчэ адна кніга з серыі "Беларуская мова: гісторыя і сучаснасць". На гэты раз сюды ўвайшлі артыкулы, прысвечаныя беларускай лексікалогіі і лексікаграфіі. І не выпадкова, што выкладчыкі нашага універсітэта ўклалі ў кнігу сваю сардэчную працу. Шырокую панараму жыцця беларускага слова прапаноўваюць нам У.В.Анічэнка, А.А.Станкевіч, Л.П.Кузьміч. Відавочна, што гэтым людзям не абыякава гісторыя роднай мовы, яе карані, сувязь з іншымі мовамі, і таму зразумела, чаму гэтае выданне не абышлося без укладу універсітэцкіх выкладчыкаў.***

Усім студэнтам філалагічнага факультэта выпала за вялікі гонар слухаць лекцыі нашага вядомага навукоўца-моваведа прафесара У.В.Анічэнкі, які ўнёс вельмі значны ўклад у зборнік. Яго артыкул прысвечаны гісторыі беларускай мовы і называецца "Лёс старажытнай лексікі Скарынінскай эпохі ў сучаснай беларускай мове". Усе ведаюць, што нараджэнне нашай роднай мовы звязана з імем Францыска Скарыны -- славутага дзеяча ўсходнеславянскай культуры. Але не ўсім вядома, які цярністы і цяжкі шлях прайшла наша мова, каб стаць такой, на якой мы размаўляем зараз. Нельга зразумець нашай мовы, не ведаючы яе каранёў, і таму паўстае пытанне: як яна дайшла да нас са старажытнасці, што змянілася ў ёй, а што засталося нязменным. Адказ не такі ўжо і складаны з пункту гледжання аўтара. У новых гістарычных умовах канкрэтныя лексемы звужалі або пашыралі свой семантычны аб'ём, і ў эпоху Скарыны семантыка лексічнай сістэмы старабеларускай мовы параўнальна са старажытнарускай эпохай канкрэтызавалася ў залежнасці ад азначэння ёю другіх паняццяў.

Шмат слоў у выніку лексічнага ўзаемадзеяння пранікалі ў нашу мову з іншых моў і ў даўні час, і працягваюць пранікаць зараз. Гэтай праблеме прысвечаны артыкул А.А.Станкевіч "Паланізмы ў беларускіх гаворках". Раней праблема лексічнага ўзаемадзеяння польскай мовы з асноўнымі масівамі беларускіх гаворак не была аб'ектам спецыяльнага аналізу. Пытанне гэта складанае і, тым не менш, цікавае для даследавання. У працы аўтаркі выкарыстаны шматлікія папярэднія назіранні, але А.А.Станкевіч, як і кожны сапраўдны навуковец, не абышлася без асабістых назіранняў. Даследаванне аўтара можна з гонарам лічыць дасканалым і грунтоўным, бо зроблены вывад: лексіка польскага паходжання адносіцца да старажытных запазычанняў, і паланізмы зведалі значную фармальна-семантычную адаптацыю ў нашай мове.

Л.П.Кузьміч займаецца вывучэннем асаблівасцей фальклорнай і нарматыўнай лексікі, і яго праца ў зборніку прысвечана іх узаемадзеянню. Артыкул заснаваны на асабістых назіраннях аўтара. Галоўнае ў ім -- супастаўляльны аналіз нарматыўнай лексікі і лексікі фальклорных твораў, што дазваляе зрабіць вывад паводле іх агульнасці, і другі не менш важны вывад аб тым, што нельга грунтоўна даследаваць літаратурную мову без вывучэння яе асновы -- мовы народнай, на якой будуюцца фальклорныя творы.

Усе мы спадзяёмся, што гэты зборнік не апошні, што навука несупынна рухаецца наперад, і праз некаторы час мы ўбачым і прачытаем новыя артыкулы і кнігі, якія напоўняць нас новымі ўражаннямі і натхняць на навуковую работу.

**Мая МЯРКУЛАВА,**
**студэнтка гр.Б-31 філалагічнага факультэта.**

Слово памяти

## ТАКИМ БЫЛ НАШ УЧИТЕЛЬ И

В этом году известному белорусскому ученому-археологу Владимиру Владимировичу Богомольникову исполнилось бы 55 лет. Но прошло уже 4 года, как близкие, друзья, коллеги и многочисленные ученики проводили его в последний путь.

В.В.Богомольников родился в Гомеле в тяжелейшем для страны 1941-м г. Вся его жизнь была связана с нашим городом и Гомельщиной. В 1969 г. он поступает на историческое отделение ГГУ и становится одним из первых его выпускников. В студенческие годы Владимир страстно увлекается романтикой археологического поиска и посвящает себя изучению древней истории Беларуси. Еще будучи старшекурсником он получает официальное разрешение Академии наук на проведение самостоятельных полевых изысканий.

После университета была аспирантура, годы кропотливой работы над диссертацией "Курганы радимичей 10-12 веков", успешно защищенной в Москве. Это исследование до сих пор остается уникальным в отечественной и мировой научной литературе.

Лучшие годы жизни В.В.Богомольникова прошли в археологических экспедициях, организатором и руководителем которых был он сам. Его научные отряды, укомплектованные студентами-историками, исследовали десятки славянских курганов на Гомельщине. Он активно помогал ученым Академии наук открывать тайны древних поселений на Витебщине и в Полесье, участвовал в организации раскопок городища летописного Гомеля. Яркие выступления ученого прозвучали на городских, республиканских и международных конференциях. Перу Владимира Владимировича принадлежат обстоятельные публикации научного характера, он выступил консультантом энциклопедии "Археология и нумизматика Беларуси" -- фундаментального исследования белорусских археологов.

Итоги изысканий археолога не остались достоянием только узкого круга специалистов. В публикациях "Гомельского университета", "Гомельскай праўды", республиканских газет Владимир Владимирович знакомил со своими открытиями рядового читателя, сочетая научную информацию с популярным стилем изложения.

В 1977 г. он приходит на работу в родной вуз, преподает основы археологии, историю древнего Востока, античных Греции и Рима. Как профессионал, Владимир Владимирович опирался на исторические источники и умело приобщал студентов в процессе занятий к их изучению и научной интерпретации. Широкий кругозор преподавателя ярко реализовался в изучении вопросов истории культуры древности. Не так-то легко показать молодежи всю прелесть, например, античной поэзии. Для этого нужно самому знать ее и любить, более того, и писать стихи собственноручно. Умел он тактично и к месту импровизировать, оживляя монотонность учебного процесса и особенно тяжелую работу на раскопках. В университетской газете часто появлялись его тонкие и добрые пародии.

Сотни студентов прошли под руководством Владимира Владимировича археологическую практику. Щедро делился он своими знаниями с воспитанниками и делал это не только профессионально, но с присущей ему особенной корректностью. В своих студентах он видел лучшее и без устали помогал им реализовывать научные способности. Бескорыстное служение делу воспитания нового поколения белорусских историков принесло свои плоды: многие студенты связали свою жизнь с преподаванием истории в школах и вузах, а некоторые -- с научной деятельностью, написали и защитили кандидатские



Лідэр

## ІМКЛІВЫ СКАЧОК "ПАНТЭРЫ"

***Мой сённяшні расказ пра групу "Пантэра" -- першы з серыі вашых музычных заявак. Напамінаю, што вашы пажаданні я гатоў выслухаць па тэлефоне 56-32-40 (каф. рускай літаратуры), а таксама з задавальненнем раскажу пра вашых любімых музыкантаў. Чакаю заявак!***

Такім чынам, "Пантэра". Група была ўтворана ў далёкім 1981 годзе, гэта значыць мае дастаткова доўгую, пятнаццацігадовую гісторыю. Створана яна была ў горадзе Арлінгтоне штата Тэхас, таго, дзе каўбоі, джынсы, дэнім і часам бандыцкія замахі на жыццё прэзідэнтаў. Спачатку Даймонд Дарэл -- гітара, Філ Ансельма -- вакал, Рэкс Рокер -- бас і Віні Пол -- "здымалі рэчы з чужога пляча", гэта значыць ігралі песні іншых груп і выканаўцаў, толькі для прыстойнасці злёгку відазмянялі іх. Так прадаўжалася каля двух гадоў. У 1983г. на невялікай незалежнай фірме выходзіць іх дэбютны дыск "Metal Magic", запісаны ў стылі паўэр-метал. Альбом выйшаў не вельмі цікавым і быў амаль незаўважаным. Крыху пазней група вырашае злёгку змяніць сваю музыку -- на трэш, і менавіта ў гэтым стылі запісвае спачатку дыск "Project in the Jungle", а праз паўгода дыск "I Am The Night", у якім відавочна чуюцца блэк-метал матывы. Падобная мітусня ў пошуках "свайго" твару была вельмі негатыўна пракаменціравана ў прэсе, у выніку чаго група на некаторы час адыходзіць ад музычных спраў. Трэба было альбо іграць нешта новае, ці змяніць назву. Рабіць гэта музыканты не вельмі хацелі, таму было прынята кампраміснае рашэнне: іграць пауэр-метал з трэшавымі фрагментамі. У гэтай стылістыцы і быў вытрыманы чарговы опус "Power Metal", які -- гэта проста дзіва! -- з захапленнем сустрэлі не толькі ў ЗША, але які і ўвайшоў у хіт-парады Еўропы!

Наступным дыскам стаў яшчэ больш жорсткі альбом "Каўбоі з пекла", група адыграла серыю канцэртаў у ЗША, Еўропе і Аўстраліі. З гэтай жа праграмай "Пантэра" выступіла на Тушынскім стадыёне ў 1991 годзе разам з Black Crowes, Metallica, ACI DCiEST.

Неўзабаве "Пантэра" выпускае цудоўны альбом "Грубая дэманстрацыя сілы", а некалькі пазней самы моцны ў тэхнічных і ідэйных адносінах дыск "Far Beyond Driven", своеасаблівы гімн радыёкіруемым зомбі. Лепшымі опусамі гэтага дыска сталі "25 Years", "Becoming" і "Good Friends and a Bottle of Pills". Менавіта з гэтым альбомам у групы звязана шырокая рэкламная кампанія на тэлебачанні ў шэрагу спецыялізаваных музычных праграм. Апошні рэліз групы -- альбом, які з'явіўся ў продажы ў сёлетнім годзе "The Great Southern Trendkill", нічым не выходзіць за рамкі звычайнага "пантэраўскага" гучання, аднак трэба адзначыць новую тэмку ў творчасці "Пантэры". Гэта -- адносіны да наркотыкаў. Найбольш цікавыя песні "Drag The Water" і абедзве часткі кампазіцыі "Suicide Note". Не менш "забойна" гучыць загаловачная кампазіцыя, якая дала назву дыску.

Да цяжкай музыкі можна адносіцца па-рознаму. Відавочна адно: група "Пантэра" за 15 гадоў свайго існавання ўнесла ўклад (і дастаткова важкі) у пауэр-метал, злучыўшы традыцыйныя формы з тыпова-амерыканскім саундам. І калі нават у далёкім ад штата Тэхас беларускім горадзе Гомелі ў кіёсках гуказапісу прадаюцца касеты групы "Пантэра" -- гэта красамоўны доказ таго, што свой скачок да славы група здзейсніла без асаблівых перашкод.

**П.БЕСЯЦКІ,**
**вядучы рубрыкі "Лідэр".**

## КОЛЛЕГА

диссертации. У Владимира Владимировича училось немало нынешних преподавателей университета -- В.П.Пичуков, М.П.Савинская, В.И.Галко, В.А.Михедько, А.М.Кротов, Н.Н. Мезга и многие другие, в т.ч. и авторы этих строк. С деятельностью в области истории, археологии, исторического краеведения связали себя С.Е.Рассадин, В.А.Литвинов, Т.Ф.Литвинова, Е.М. Веремейчик и другие его ученики.

Детищем Владимира Владимировича стал организованный им при кафедре всеобщей истории Археологичекий музей, в котором стараниями его создателя и первого директора, а также многочисленных помощников-студентов были собраны сотни научно значимых экспонатов, отражающих историю нашего края.

Владимира Владимировича Богомольникова с нами нет, но его научные труды публикуются и по сей день, созданный им музей приобщает к дыханию седого прошлого и нынешние поколения студентов, а светлая память о нем живет в серцах его учеников и коллег.

**Е.БРОВКИН,**
**ст.преподаватель;**
**О.МАКУШНИКОВ,**
**доцент кафедры**
**всеобщей истории.**

Цырк

## У ГАСЦЯХ У КЛОУНА

Новая праграма пад такой назвай ідзе цяпер на арэне гомельскага цырка.

Смех, сцвярджаюць, лепшае лякарства ад усіх нягод, ён узнімае настрой, падаўжае чалавечае жыццё. У такім выпадку вельмі ўжо адказная місія ўскладваецца на цыркавых клоунаў, якім сваім майстэрствам трэба рассмяшыць публіку -- і дарослую, і дзіцячую.

Аляксандр Родзін займаецца гэтым ужо шмат гадоў. Яго імя вядома сёння далёка за межамі Расіі, бо пабываў ён на гастролях у многіх краінах свету. Ён -- уладальнік прыза "Оскар" Каралеўскага цырка ў Бруселі, народны артыст Расіі.

У нашым горадзе А.Родзін выступае не ўпершыню, яму знаёма гомельская публіка, якую ён лічыць вельмі добразычлівай і разумеючай гумар. З размовы з гэтым выдатным майстрам клаунады стала вядома таксама, што яму вельмі падабаецца атмасфера гомельскага цырка, зладжаная работа ўсіх яго службаў. А адсюль -- жаданне выступаць тут з самай поўнай аддачай. І гэта бачна ў час прадстаўлення. Цяжка стрымацца ад усмешкі, калі на арэну выходзіць А.Родзін са сваімі рэпрызамі, фокусамі, забаўнымі трукамі. Ён выдатна валодае залай, яе настроем, у асаблівым захапленні ад яго жартаў дзеці.

Шмат у праграме іншых цікавых і арыгінальных нумароў з дрэсіраванымі жывёламі -- вярблюдамі, марскімі львамі, сабачкамі і поні. І зусім ужо ў здзіўленні і захапленні глядач ад птушынага "балета": дрэсіраваныя пеўні Т. Калабашкінай танцуюць на пуантах, у лапцях і іншым далёка не птушыным абутку.

Галавакружнымі трукамі пад самым купалам цырка, незвычайнай сілай, віртуёзнасцю і грацыяй зачаруюць вас эквілібрыст В.Чыканаў, сілавы жанглёр В.Русо, гімнаст А.Любімаў, сола-жанглёр А.Грачова і іншыя майстры арэны.

Т.НІКАЛАЕВА.

•спорт •спорт •спорт •спорт •спорт

## ЁСЦЬ МАЙСТАР СПОРТУ!

Студэнты і выкладчыкі нашага універсітэта ведаюць, што два гады назад упершыню расчынілі свае дзверы трэнажорная зала і аднаўленчы комплекс, якія размешчаны за першым корпусам ГДУ і ў якія шмат сіл і працы ўклалі выкладчыкі і лабаранты кафедры фізічнага выхавання. А ўзначаліў гэту работу загадчык названай кафедры дацэнт В.А. Каляда.

Цяпер тут павышаюць спартыўнае майстэрства студэнты, якія займаюцца пауэрліфтынгам (сілавое трохбор'е) і армрэстлінгам (барацьба на руках за спецыяльным сталом), а таксама групы агульнай фізічнай падрыхтоўкі.

Зусім нядаўна ў Гомелі прайшлі чэмпіянат і першынство Беларусі па пауэрліфтынгу. Выпускнік фізічнага факультэта Андрэй Садоўскі выступіў у вагавай катэгорыі да 67,5 кг і ў жыме лежачы ўстанавіў рэкорд Беларусі (142,5 кг). Ён упершыню выканаў нарматыў "Майстар спорту Рэспублікі Беларусь".

Першакурснік факультэта фізічнай культуры Дзмітрый Глухотка ўстанавіў тры юнацкія рэкорды Беларусі -- у прысяданні з вагой, станавай цязе і ў суме трохбор'я (вагавая катэгорыя 100 кг) і ўпершыню выканаў нарматыў кандыдата ў майстры спорту.

Нагадаю, што старшым трэнерам універсітэцкай каманды два гады з'яўляецца старшы выкладчык кафедры фізвыхавання, намеснік дэкана па выхаваўчай і спартыўна-масавай рабоце матэматычнага факультэта Уладзімір Аляксандравіч Галавач. Ён не толькі валодае методыкай падрыхтоўкі спартсменаў высокага ўзроўню, але і сам працягвае павышаць сваё майстэрства, выступаючы ў групе ветэранаў на чэмпіянатах Беларусі і міжнародных турнірах, дзе ўжо не раз станавіўся прызёрам спаборніцтваў.

Студэнты і выкладчыкі вераць у тое, што гэта не апошні майстар спорту, які выйдзе з нашай трэнажорнай залы.

## МЕДАЛІ ЎСІХ ПРОБ

У Мінску прайшоў міжнародны турнір па вольнай барацьбе, прысвечаны памяці прафесара Баляслава Рыбалкі, у якім акрамя беларускіх барцоў выступілі спартсмены Латвіі.

На рахунку студэнтаў нашага універсітэта дзве залатыя, сярэбраная і бронзавая ўзнагароды. Вось імёны нашых лаўрэатаў. Пераможцамі сталі Валерый Кандраценка (48 кг) з факультэта фізічнай культуры і аспірант кафедры фізвыхавання Мікалай Краснапееў (74 кг).

У студэнтаў факультэта фізічнай культуры Аляксея Карэбы (82 кг) -- другое і Аляксандра Варанога (62 кг) -- трэцяе месцы.

Такі набор узнагарод стварае гонар нашым студэнтам і трэнерам.

## У ГАНДБАЛІСТАК -- "СЕРАБРО"

У Мінску прайшлі спаборніцтвы па гандболу сярод жаночых каманд у праграме спартакіяды ВНУ Беларусі.

Наша каманда "Універсітэт" пераіграла гандбалістак Беларускай сельгасакадэміі -- 66:5, Гродзенскага універсітэта -- 31:13, Брэсцкага універсітэта -- 36:17, Магілёўскага педінстытута -- 28:16 і ўступіла (не без дапамогі мінскіх суддзяў, як сцвярджае галоўны трэнер каманды заслужаны трэнер Беларусі Валерый Крукоўскі) адзін мяч студэнткам Акадэміі фізічнай культуры і спорту -- 23:24. У выніку тройка прызёраў такая: Акадэмія фізкультуры і спорту, ГДУ імя Ф.Скарыны, Гродзенскі дзяржуніверсітэт.

Добра правялі турнір Таццяна Швец (эканамічны факультэт), Ірына Тамашова і Іна Кукбая (факультэт фізічнай культуры).

**В.МАРЧАНКА,**
наш спартыўны аглядальнік.

## *Вясёлы перапынак* МІЖ РАДКАМІ КАНСПЕКТАЎ

*•Вне конкуренции тот, кто постоянно на последнем месте.*

*•Он всё чаще ловил себя на мысли, что ни о чём не хочет думать.*

*•Ещё не ясно, выжил бы Робинзон, ели бы остров был обитаем.*

*•Студенческая жизнь прекрасна и без экзаменов.*

*•Хотя вы и преподаватель, но всё равно вас уважаю.*

*•Чтобы успеть туда, куда торопишься, необходимо остановиться и подумать.*

*•Из книг можно выбрать самое важное, но до того их необходимо прочесть.*

*•Студенческая философия: что можешь съесть сегодня, не откладывай на завтра; что можешь сделать завтра, не делай сегодня!*

*•Можно ли требовать твёрдых знаний от хрупких девушек?*

*•Студент не знал предмета в двух случаях: пока не проходил и когда прошёл.*

*•Одна голова не только хорошо, но и вполне достаточно.*

**ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ імя Ф.СКАРЫНЫ**

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад па кафедрах:

-- эканамічных тэорый -- асістэнта;

-- ВМ і праграміравання -- асістэнта.

Тэрмін падачы заяў -- не пазней І месяца з дня апублікавання паведамлення.

Заявы накіроўваць на адрас: 246699, г.Гомель, вул. Савецкая, 104.

**РЭКТАРАТ.**

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытый публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК -- Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 1-18, тэл. 57-43-21.
Рэгістрацыйны № 263

Спонсар газеты -- прафком студэнтаў.

Газета набрана і зверстана на настольна-выдавецкім комплексе ІВЦ ГДУ, аддрукавана на фабрыцы "Паледрук", г.Гомель, вул. Савецкая, 1.

Рэдактар Ул.П. БАЛОГА

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.000 экз.
Заказ 600.
Падпісана да друку 5.12.96.